## БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ
## ФАКУЛЬТЭТ ІНФАРМАЦЫЙНА-ДАКУМЕНТНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ
## КАФЕДРА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ І МУЗЕЯЗНАЎСТВА

### ЗАПРАШАЕ ВАС АТРЫМАЦЬ ВЫШЭЙШУЮ АДУКАЦЫЮ
**па спецыяльнасці**
### *"МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ"*





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падрыхтоўка кадраў па гэтай спецыяльнасці адбываецца ўжо 20 гадоў і ахоплівае асноўныя кірункі развіцця музеяў свету і Беларусі, а таксама важнейшыя праблемы, звязаныя з аховай помнікаў гісторыі, культуры, уключэннем музеяў у турыстычную дзейнасць. Нашы выпускнікі запатрабаваны незвычайна: працуюць дырэктарамі абласных і раённых музеяў у Віцебску, Вілейцы, Лагойску і іншых гарадах, галоўнымі захавальнікамі музейных фондаў, старшымі навуковымі супрацоўнікамі ў музеях.

Спецыяльнасць "музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны" патрабуе глыбокіх і разнастайных ведаў, таму студэнты вывучаюць гісторыю Беларусі, сусветную гісторыю, гісторыю і тэорыю культуры, гісторыю краязнаўства, такія спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны, як нумізматыка, сфрагістыка, адну з замежных моў (англійская, французская, нямецкая і іспанская), а таксама лацінскую і польскую. З трэцяга курса пачынаецца самае цеснае знаёмства са спецыяльнасцю, таму студэнты вывучаюць гісторыю музейнай справы, навукова-фондавую дзейнасць музея, тэорыю і практыку экскурсійнай работы, інфармацыйныя тэхналогіі ў музеях, гісторыю і арганізацыю турызму, і іншыя дысцыпліны, звязаныя з турыстычным кірункам.

Работа ў музеі і турыстычнай сферы - гэта праца з наведвальнікамі, таму нашым студэнтам выкладаюцца сцэнарна-рэжысёрскія асновы музейнай і турыстычнай дзейнасці. Тэарэтычныя веды замацоўваюцца падчас практыкі ў сталічных музеях і турыстычных фірмах.

Студэнты маюць магчымасць удзельнічаць у навуковых канферэнцыях, пасля заканчэння навучання паступіць у магістратуру, затым аспірантуру, абараніць кандыдацкую дысертацыю ў савеце ўніверсітэта.

Спецыфіка нашага ўніверсітэта дазваляе студэнтам удзельнічаць у самых разнастайных культурных мерапрыемствах. Для іх арганізуюцца экскурсіі па рэгіянальных музеях і памятных мясцінах Беларусі, сустрэчы з цікавымі людзьмі.

Універсітэт мае два добраўпарадкаваныя сучасныя інтэрнаты.

Калі ў вас узнікла жаданне атрымаць адукацыю ў галіне музейнай справы і турызму, то трэба падрыхтавацца і здаць тэсты. беларуская (ці руская) мова; гісторыя Беларусі; усеагульная гісторыя (найноўшы час).

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў запрашае абітурыентаў для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання па гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі. Лепшыя выкладчыкі дапамогуць вам авалодаць неабходнымі ведамі для паспяховай здачы цэнтралізаванага тэсціравання.

**Тэлефоны для даведак:**
+375 (017) 2094997 (кафедра);
+375 (017) 222 83 06 (прыёмная камісія).

Парадак і правілы прыёму, даты правядзення дзён адкрытых дзвярэй і іншая інфармацыя на сайце ўніверсітэта: ***www.buk.by***.

***Сардэчна запрашаем у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў на спецыяльнасць***
***"МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ"!***